ўзнаўляецца ў лірычных творах, паколькі лірыка як род літаратуры дазваляе прама і непасрэдка выявіць эмоцыі суб'екта маўлення, перадаць яго настрой. Пэўныя тыпалагічныя сыходжанні на ўзроўні зместу і сістэмы вобразаў дэтэрмінаваныя найперш геаграфічна, а менавіта падабенствам ландшафту і клімату Латгаліі і Падзвіння. Разам з тым яны грунтуюцца і на псіхалагічнай аснове, паколькі вобразы роднага краю ствараюцца людзьмі так званага пераходнага часу.

Геапаэтыка мае не толькі эстэтычнае вымярэнне, але і прыкладное, інфармацыйна-пазнавальнае, імагалагічна-рэпрэзентатыўнае. У гэтым сэнсе плён геапаэтыкі можа выкарыстоўвацца ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу ў галіне турызму, у прыватнасці ў сферы культурнага турызму, акрамя таго, высокамастацкая і этычна-карэктная геапаэтыка садзейнічае полінацыянальнаму дыялогу ў сучасным свеце, росту ўзаемаразумення паміж народамі.

1. Голованов, В. Геопоэтика Кеннета Уайта / В. Голованов // Октябрь. – 2002. – № 4. – С. 158–183.
2. Барадулін, Р. Вечалле: кніга паэзіі. – Мінск : Маст. літ., 1980. – 336 с.
3. Дзвіна : Віцебшчына літаратурная. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 334 с.
4. Дзвіна (Віцебшчына літаратурная): альманах. – Вып. 4. – Віцебск : Віцеб. абл. друкарня, 2005. – 176 с.
5. Канапелька, А. Жыццё прадоўжыцца ў песні / А. Канапелька. – Віцебск : Выд-ва Віцеб. дзярж. ун-та, 2010. – 73 с.

**Казак Т.В., Касатая Т.У.**

## БЯСПЛАТНЫЯ ЭКСКУРСІІ ЯК АДНА З ФОРМ АКТУАЛІЗАЦЫІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Гродна, Рэспубліка Беларусь

Адной з форм адукацыйнай і асветніцкай дзейнасці з мэтай прыцягнення ўвагі да гістарычных помнікаў з'яўляюцца экскурсіі. Арганізатарамі экскурсій традыцыйна выступаюць камерцыйныя, дзяржаўныя, адукацыйныя ўстановы і іх супрацоўнікі.

Традыцыйна экскурсія з'ўляецца асноўнай формай працы з турыстамі. Але яна пастаянна развіваецца, паўстаюць яе новыя віды. На працягу апошняга дзесяцігоддзя ў Еўропе некаторыя турфірмы спачатку як рэкламу, а потым пастаянна арганізоўваюць бясплатныя экскурсіі па папулярным мясцінам, а таксама па нетрадыцыйным маршрутам.

У Беларусі падобныя экскурсіі праводзяцца ў асноўным у межах дзейнасці краязнаўчых гурткоў для дзяцей і моладзі. Для шырокай грамадскасці іх сталі праводзіць актыўна з 2009 г. Ідэю прапанавалі

Репозиторий ВГУ

арганізатары першага фестываля экскурсій “Фэст экскурсаводаў” БК ICOMOS і Павал Кавалёў тагачасны старшыня ГКТ "ЭТНА" пры Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтва. Фэстываль быў прымеркаваны да Міжнароднага дня помнікаў і гістарычных мясцін, які адзначаецца 18 красавіка.

Падчас фестываля была праведзена бясплатная экскурсія і па гораду Гродна, арганізаваная мясцовымі краязнаўцамі. Пасля было вырашана праводзіць бясплатныя экскурсіі па магчымасці часцей. У іх арганізацыі дапамагалі гісторыкі, навуковыя супрацоўнікі музеяў, краязнаўцы, святары. Экскурсія знайшла водгук у мясцовых сродках інфармацыі. Менавіта яны дапамагалі ў рэкламе фестываля. Адным з арганізатараў рэкламы быў блог гарадскіх навінаў s13.ru.

У 2010 – 2011 гг. у Гродна ў межах “Фэста экскурсаводаў” было праведзена амаль дзесяць экскурсій. У тым ліку дэбютныя экскурсіі, якія ўжо сталі папулярнымі турыстычнымі маршрутамі па горадзе. Сярод іх “Яўрэйскі Гродна” – дадзены маршрут прыцягвае ўвагу да спадчыны яўрэйскага народа, яго гісторыі, традыцыяў. “Кінатэатральны Гродна” – гісторыя тэатра і сінематографа. “Гродзенскі трохкутнік” – экскурсія, якая складаецца з успамінаў Васіля Быкава, Аляксея Карпюка і Барыса Клейна, што стварылі сапраўдны клуб шасцідзесятнікаў у Гродна.

Гродзенскі гарадскі раён Новы свет ўжо на працягу некалькіх гадоў даследваюць гісторыкі, краязнаўцы і проста аматары міжваеннай гісторыі. Асаблівая ўвага была прыцягнута да яго падчас спробы грамадскасці захаваць адну з яго частак – будынкі Залатой горкі. На жаль мясцовыя ўлады знішчылі сапраўды прыгожыя і рэдкія ў архітэктурным плане пабудовы. Паступова Новы свет стаў месцам правядзення экскурсій з мэтай прыцягнення ўвагі да захавання спадчыны гэтага раёна.

На працягу 2009-2010 гг. праводзіліся бясплатныя экскурсіі, кожная з якіх збірала традыцыйна каля 50 чалавек. Такім чынам, экскурсіі сталі адыгрываць не толькі адукацыйную ролю, але і спрыялі папулярызацыі гістарычных мясцін, якія знаходзяцца пад пагрозай знішчэння. Дзякуючы экскурсіям па асобных гарадскіх раёнах фарміруецца лакальная супольнасць і самаідэнтыфікацыя жыхароў.

Бясплатныя экскурсіі сталі часткай асветніцкага праекта “У пошуках гісторыі: паўсядзённае жыццё савецкага Гродна”. На працягу года жыхары горада адкрывалі гродзенскую гісторыю савецкіх часоў. Сярод экскурсій былі праведзены цалкам новыя: “Верасень 1939 года. Нараджэнне савецкага Гродна”, “Гродна за партай: савецкая культура і адукацыя”, “Новыя гарызонты: архітэктура Гродна савецкага часу”, “Нефармальны Гродна: грамадства ў пошуку выбара” і інш. Экскурсіі праводзілі добра вядомыя ў горадзе гісторыкі Віктар Саяпін, Андрэй



Репозиторий ВГУ

Вашкевіч, Андрэй Чарнякевіч, Ігар Трусаў. Савецкая спадчына, нягледзячы на нядаўнія часы яе стварэння, стала сапраўды цікавай для жыхароў Гродна.

Гэты від экскурсій становіцца часткай нефармальнай адукацыі дарослага насельніцтва горада. Так падчас **"**Тыдня нефармальнай адукацыі - 2011**"** у Гродна быў праведзены краязнаўцам Ігарам Лапехай цыкл з 4-х тэматычных экскурсій "Страчаная Гародня". Такія экскурсіі з'яўляюцца спробай пабудаваць віртуальны горад, што з'яўляецца важным не толькі ў адносінах да Гродна, але і большасці гарадоў Беларусі, якія былі моцна разбураны падчас апошняй вайны і савецкага часу. Гэтыя экскурсіі дазваляюць па-новаму паглядзець на страчанае аблічча горада, уявіць яго былую веліч.

Бясплатная экскурсія – амаль універсальны сродак прыцягнення ўвагі да праблемы захавання і аднаўлення гісторыка-культурнай спадчыны, да падзеяў з гісторыі. Напрыклад, у дзень народзінаў Васіля Быкава ў Гродне праводзілася бясплатная экскурсія "Гродзенскімі шляхамі Васіля Быкава", якая можа стаць традыцыйным напамінам пра пісьменніка і яго дзейнасць у Гродна.

Такім чынам, тэматыка бясплатных экскурсій вельмі шырокая, а самі экскурсіі даюць магчымасць экскурсаводам паказаць свой патэнцыял, які не заўсёды можна праявіць падчас традыцыйных аглядных экскурсій. З іншага боку такія экскурсіі дазваляюць прыцягнуць увагу да помнікаў, аб'ектаў архітэктуры розных часоў, якія не заўсёды трапляюць у вока экскурсантаў. Адной з асноўных функцый бясплатных экскурсій з'яўляецца інтэрпрэтацыя гісторыка-культурнай спадчыны сярод шырокага кола грамадскасці, фарміравання самаідэнтычнасці, актывізацыі жыхароў горада да дзейнасці па ахове помнікаў, развіцця горада.

Перспектывамі развіцця бясплатных экскурсій з'яўляецца далучэнне да еўрапейскіх фірм, якія праводзяць дадзеныя экскурсіі ў розных краінах пад назвай Free Tours. Важным будзе стварэнне адукацыйнай сеткі для навучання будучых экскурсаводаў. Варта ўзгадаць, што ў Гродна курсы экскурсаводаў не арганізуюцца ўжо доўгі час. Менавіта сярод новых экскурсаводаў могуць паўстаць і новыя маршруты па горадзе і ваколіцах. Пашырэнню правядзення бясплатных экскурсій будуць садзейнічаць і змены ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь. З 2011 г. экскурсіі з'яўляюцца масавымі мерапрыемствамі, якія патрабуюць дазволу з боку мясцовых органаў самакіравання. Гэта стварае пэўныя складанасці ў арганізацыі і правядзенні бясплатных экскурсій.



Репозиторий ВГУ